## Секция 10
## БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК И ЛИТЕРАТУРА: ОСНОВНЫЕ ФОРМЫ ИЗУЧЕНИЯ В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ УНИВЕРСИТЕТЕ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ

***Т. П. Біруля,***
*старшы выкладчык;*
***Н. В. Лешчанка,***
*старшы выкладчык*
*кафедры беларускай і замежнай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# УЖЫВАННЕ ПЛАТФОРМЫ ZOOM У ПРАЦЭСЕ ДЫСТАНЦЫЙНАГА НАВУЧАННЯ ЗАМЕЖНЫМ МОВАМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе адлюстроўвае асноўныя рысы рэчаіснасці і змяняецца з развіццём грамадства. Хуткае развіццё інфармацыйных тэхналогій і выклікі сучаснага свету ўносяць свае карэктывы ў метады навучання, падштурхоўваючы да пераасэнсавання і ўдасканалення традыцыйных формаў і прыёмаў. Аб'ектыўная неабходнасць рэалізоўваць адукацыйны працэс пры адсутнасці непасрэднага кантакту з навучэнцамі прымусіла па-новаму зірнуць на многія інфармацыйныя рэсурсы.

Навучанне замежнай мове на платформах анлайн мае свае асаблівасці. Яны звязаны з тым, што галоўным кампанентам працэсу з'яўляецца не засваенне пэўнай інфармацыі, а развіццё розных відаў маўленчай дзейнасці, г. зн. фарміраванне і развіццё камунікатыўных навыкаў [2].

Адзін з крытэрыяў класіфікацыі метадаў навучання як у вочнай, так і ў дыстанцыйнай форме – гэта ступень удзелу пе-

дагога і навучэнца ў пастаноўцы і вырашэнні навучальных задач. На падставе гэтага крытэрыю вылучаюць пасіўны, актыўны, інтэрактыўны метады.

Інтэрактыўнае навучанне – гэта педагагічны падыход, які спрыяе актыўнаму ўдзелу навучэнцаў у працэсе атрымання адукацыі. Мэта інтэрактыўнага навучання заключаецца ў тым, каб арыентаваць навучэнцаў на самастойную выпрацоўку стратэгій атрымання ведаў, уменняў і навыкаў. Навучыць вучыцца (самастойна знаходзіць, здабываць, засвойваць і выкарыстоўваць веды) – і ёсць сутнасць інтэрактыўнага падыходу. Тэарэтыкі такога падыходу выступаюць за індывідуальны навучальны план са стратэгіямі навучання, актыўна заахвочваюць асабісты ўдзел, пастаноўку і рашэнне праблем самімі навучэнцамі. Як бачым, інтэрактыўны метад, або інтэрактыўны стыль навучання, прадугледжвае ўзаемадзеянне паміж педагогам і навучэнцамі, узаемадзеянне навучэнцаў унутры групы, а таксама ўзаемадзеянне груп з педагогам [3].

Тэхналогіі дыстанцыйнага навучання развіваюцца па меры ўдасканалення тэхнічных сродкаў і носьбітаў інфармацыі. У сувязі з неабходнасцю арганізаваць масавае дыстанцыйнае навучанне разам з даўно існуючымі платформамі Moodle, Google Classroom, Google Docs, Google Jamboard, WebTutor, iSpringLearn пачалі актыўна выкарыстоўвацца сэрвісы Zoom, Viber і Skype для правядзення анлайн-заняткаў.

У БДУКМ для правядзення заняткаў, бягучага і выніковага кантролю актыўна задзейнічаны zoom-канферэнцыі. Дадзены сэрвіс дазваляе выкладчыку выкарыстоўваць парныя, групавыя, калектыўныя формы кантактаў ва ўмовах не фізічнага, а віртуальнага ўзаемадзеяння, г. зн. рэалізоўваць інтэрактыўнасць.

Zoom – гэта воблачная платформа для правядзення відэаканферэнцый, якая дазваляе мець зносіны анлайн у даступным фармаце ў рэжыме рэальнага часу. Дзякуючы сваім функцыянальным асаблівасцям Zoom дазваляе выкладчыкам праводзіць урок максімальна эфектыўна пры дыстанцыйнай форме навучання. Платформа Zoom прапануе камунікацыйнае праграмнае забеспячэнне, што, на нашу думку, з'яўляецца адной з асноўных пераваг дадзенай сістэмы, якая аб'ядноўвае відэаканферэнцыі, чат і сумесную працу навучэнцаў і выкладчыкаў з дапамогай выкарыстання розных яе функцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навучанне замежнай мове прадугледжвае непасрэдную камунікацыю паміж навучэнцамі і выкладчыкам у розных відах і формах. Платформа Zoom рэалізуе дадзеныя ўмовы, паколькі педагог, ён жа арганізатар канферэнцыі, стварае магчымасць для зносін як у вуснай, так і ў пісьмовай форме, карыстаючыся рознымі функцыямі, якія прапануе такая сістэма. Напрыклад, выкладчык-арганізатар мае магчымасць кіраваць мікрафонам, г. зн. арганізоўваць аўдыёўспрыманне і відэа для ўсіх удзельнікаў канферэнцыі, ствараць свайго роду лінгафонны клас для адпрацоўкі навыкаў аўдзіравання і чытання, дэманстраваць экран сваёй лічбавай прылады для паказу розных інфармацыйных матэрыялаў, у тым ліку аўдыё- і відэаматэрыялаў, прэзентацый, электроннай версіі ВМК, наглядных матэрыялаў.

Выкладчык падчас дэманстрацыі экрана з дапамогай функцыі «Каментаваць» можа вылучыць тыя моманты, на якія неабходна звярнуць асаблівую ўвагу, або выканаць розныя практыкаванні. Навучэнцы могуць паказваць выкананае дамашняе заданне на сваім экране з дапамогай рэалізацыі функцыі «Сумеснае выкарыстанне экрана», а выкладчык-арганізатар канферэнцыі, у сваю чаргу, на ўласным бачыць экран студэнта, карэкціруе заданне і выстаўляе адзнаку. Яшчэ адна карысная функцыя, «Чат», дае магчымасць пісаць пытанні і даваць на іх адказы без уключэння мікрафона, г. зн. адпрацоўваць навыкі пісьма. Можна ўводзіць новыя лексічныя адзінкі для вывучэння або адпраўляць файлы і рознага выгляду дакументы адразу ўсім навучэнцам або выбарачна, што дапамагае забяспечваць дыферэнцыраваны падыход у навучанні замежнай мове. Акрамя таго, у платформу ўбудавана інтэрактыўная дошка, што дазваляе ажыццяўляць непасрэдную зваротную сувязь з навучэнцамі ў рэжыме рэальнага часу: выкладчык мае магчымасць візуальна тлумачыць матэрыял, даваць пісьмовыя заданні і непасрэдна на ўроку іх правяраць, адпрацоўваць неабходны лексічны і граматычны матэрыял, працаваць з наглядным матэрыялам. Адной з неабходных для навучання замежнай мове функцый дадзенай платформы з’яўляецца магчымасць запісу ўрока. Выкладчык мае магчымасць паказаць мінулы ўрок тым навучэнцам, што па якой-небудзь прычыне не змаглі прысутнічаць на анлайн-уроку ў той ці іншы час. У Zoom мы можам падзяліць студэнтаў на пары або групы для працы над

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

індывідуальнымі заданнямі: напрыклад, стварэнне дыялагічнага або маналагічнага выказвання, праекты або творчыя майстэрні.

Такім чынам, выкладчыкі захоўваюць звыклыя метады працы, эфектыўна ўкараняючы іх у новы фармат урока. Іншымі словамі, Zoom мае шмат добрых якасцей, што робіць дадзены сэрвіс незаменным для выкладчыкаў замежнай мовы ў перыяд дыстанцыйнага навучання, але самая галоўная вартасць – гэта тое, што платформа дазваляе выкарыстоўваць жывое маўленне пры ўзаемадзеянні з навучэнцамі, без чаго вывучэнне замежнай мовы немагчыма, і тым самым спрыяе арганізацыі паўнавартасных урокаў замежнай мовы ў складанай абстаноўцы сучасных рэалій.

Пэўны вопыт выкарыстання інфармацыйных тэхналогій для аператыўнай рэалізацыі адукацыйных задач у перыяд неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыі выявіў умовы, без якіх немагчыма ажыццяўленне эфектыўнага інтэрактыўнага дыстанцыйнага адукацыйнага навучання. Сярод іх:

– тэхнічныя ўмовы: віртуальная платформа, мэтазгодная з пункту гледжання вырашэння пэўных педагагічных задач; доступ у Інтэрнэт і яго стабільная праца; наяўнасць сучасных камп’ютараў, камер, навушнікаў і іншых тэхнічных сродкаў, неабходных для правядзення заняткаў; прадуманая і эфектыўная схема ўзаемадзеяння ўдзельнікаў навучальнага працэсу;

– метадычныя ўмовы: метадычнае забеспячэнне, г. зн. наяўнасць тэкставых і аўдыявізуальных навучальных матэрыялаў у сумяшчальных фарматах; зручная і аб’ектыўная сістэма тэсціравання і кантролю; кваліфікаваныя выкладчыкі, якія ўмеюць прымяняць розныя інтэрактыўныя метады і тэхналогіі дыстанцыйнай формы навучання і валодаюць не толькі сваёй прадметнай вобласцю, але і інфармацыйнымі тэхналогіямі;

– псіхалагічныя ўмовы: матывацыя педагога для распрацоўкі якасных навучальных матэрыялаў; індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці студэнтаў, г. зн. самадысцыпліна, свядомасць і самастойнасць; добразычлівая атмасфера віртуальных кантактаў [1].

Нягледзячы на свае відавочныя вартасці платформа мае некаторыя недахопы, найбольш істотным з якіх з’яўляецца абмежаванне сесіі па часе – 40 хвілін. Вядома, як і любая анлайн-платформа, Zoom патрабуе наяўнасці хуткаснага Інтэрнэту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, платформа Zoom уяўляецца найбольш эфектыўнай для правядзення ўрокаў замежнай мовы ва ўмовах дыстанцыйнага навучання, паколькі дазваляе захаваць такі найважнейшы і фундаментальны фактар паспяховасці набыцця асноўных навыкаў і ўменняў, як камунікацыя, без чаго немагчыма авалоданне моўнай кампетэнцыяй, што з'яўляецца асноўным вынікам навучання замежнай мове.

1. *Фомина, А. С.* Онлайн-обучение в высшем учебном заведении: методики, контент, технологии / А. С. Фомина // Общество: социология, психология, педагогика. – 2016. – № 1. – С. 101–106.

2. *Щерба, Л. В.* Преподавание языков в школе. Общие вопросы методики : учеб. пособие для студ. филол. факультетов / Л. В. Щерба. – 3-е изд., испр. и доп. – СПб. : Филфак СПбГУ ; М. : Академия, 2003. – 160 с.

3. *Renner, R.* Interactive Learning Definition [Electronic resource] / Rebecca Renner. – Mode of access: http://www.ehow.com/info_7953175_ theories-interactive-learning.html#ixzz2rJnbRKSJ. – Date of access: 02.10.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Н. А. Булацкая,***
*кандидат филологических наук, доцент,*
*профессор кафедры белорусской*
*и зарубежной филологии*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*

## ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ В ПИСАТЕЛЬСКОЙ СУДЬБЕ Е. А. ТАРАТУТЫ

Исследуя роль литературы в духовной жизни социума, важно помнить и о временах, непосредственно предшествующих нашему. Синтез прошлого в сопряженности с настоящим и будущим придает современной художественной концепции духовности историческую масштабность и новизну. Это важные звенья, и они принципиальны в рассмотрении функций (познавательной, преобразующей) литературы в духовной жизни общества. Недостаточная осведомленность современной молодежи в истории литературы, объясняемая малой начитанностью, может быть восполнена знаниями о духовном опыте прошлого. А история личности может быть представлена как